**КРЫ́ТЫКА ЛІТАРАТУ́РНАЯ**, ацэнка і аналіз мастацкага твора; від літ. творчасці. З'яўляецца састаўной часткай літаратуразнаўства і ў той жа час мае агульныя рысы з маст. творчасцю і публіцыстыкай. Выяўляе і аналізуе факты літ. жыцця, заканамернасці развіцця літ. працэсу на сучасным этапе. Прадстаўлена рознымі жанравымі структурамі (рэцэнзія, кароткі водгук, праблемны, дыскусійны, аглядны і інш. тыпу артыкулы, эсэ, памфлет і інш.). Першыя прафес. аўтары (Ф.Багамолец, Ф.Карпінскі, А.Нарушэвіч, Ю.Нямцэвіч і інш.), якія адначасова былі і літ. крытыкамі, з'явіліся на тэр. Беларусі ў перыяд Асветніцтва. У эпоху Рамантызму актывізацыя літ. жыцця звязана з асяродкамі студэнцкіх т-ваў у Вільні. Да аналізу і ацэнкі творчасці тагачасных пісьменнікаў звярталіся І.Лялевель, А.Міцкевіч, Я.Чачот і інш. даследчыкі, якія патрабавалі ад аўтара непасрэднай сувязі з жывой культурай народа, сцвярджалі ідэі патрыятызму, адметнасці славян. Аднымі з першых да аналізу сучаснага літ. працэсу звярнуліся У.Сыракомля («Працы В.Дуніна-Марцінкевіча»), А.Ельскі («Беларуская літаратура і бібліяграфія», «Каляндарныя матэрыялы па беларускай літаратуры»). Важную ролю ў актывізацыі вывучэння бел. л-ры адыгралі газ. «Наша ніва» (1906—15), час. «Маладая Беларусь» (1912—13), «Лучынка» (1914), дзе друкаваліся артыкулы М.Багдановіча, С.Палуяна, В.Ластоўскага, У.Самойлы, Л.Гмырака і інш. Нягледзячы на высокі ўзровень разумення тэндэнцый развіцця новай бел. л-ры, патрыятызм, дасведчанасць крытыкаў, іх выступленні часта мелі эпізадычны характар і не засноўваліся на пэўнай навук. метадалогіі. У 1920-я гг. ўзніклі літ.-крытычныя дадаткі да газ. «Савецкая Беларусь» («Радавая Рунь», 1924; «Літаратурная крытыка», 1925—27), выходзілі час. «Полымя» (1922), «Маладняк» (1923), «Асвета» (1924), якія аб'ядноўвалі найб. значныя літ.-крытычныя сілы (М.Байкоў, І.Замоцін, М.Піятуховіч, З.Жылуновіч і інш.), з'явіліся грунтоўныя літ.-знаўчыя працы М.Гарэцкага, М.Піятуховіча, А.Вазнясенскага, І.Замоціна. Асаблівы ўклад у развіццё К.л. зрабіў М.Гарэцкі («Гісторыя беларускае літаратуры»), які ўпершыню навукова выявіў заканамернасці развіцця бел. л-ры, паказаў яе жанрава-стылявую разнастайнасць. У пач. 1930-х гг. у развіцці К.л. адбыўся значны спад, знізіўся яе навук.-тэарэт. ўзровень. У першыя пасляваен. гады з крытычнымі артыкуламі выступалі Я.Колас, К.Крапіва, П.Глебка. З цягам часу К.л. пачала змагацца за мастацкасць л-ры, выступіла супраць рамесніцтва, спрошчанасці. У друку з'явіліся рэцэнзіі і артыкулы М.Ларчанкі, В.Барысенкі, С.Майхровіча. Якасна новага ўзроўню К.л. дасягнула ў канцы 1950-х — 1960-я гг. (кн. А.Адамовіча, В.Каваленкі, А.Яскевіча, Д.Бугаёва, А.Лойкі, У.Калесніка, Я.Усікава і інш.). Для крытыкі гэтага часу характэрны творчы падыход, смеласць у пастаноўцы актуальных праблем, грамадзянскі тэмперамент. У 2-й пал. 1960-х — 1970-я гг. К.л. ўзбагацілася тэарэт. працамі: выйшлі манаграфіі Р.Бярозкіна, А.Лойкі, І.Навуменкі, М.Яроша, В.Жураўлёва, В.Рагойшы. У 1975 выдадзена першае даследаванне па гісторыі бел. крытыкі «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства» М.Мушынскага. У 1980—90-я гг. К.л. стала больш разнастайнай. Створаны новыя праграмы, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, напісаны шэраг кн. (даследаванні В.Рагойшы, І.Багдановіч, П.Васючэнкі, А.Лойкі, Я.Клімуця, І.Шпакоўскага і інш.). У гэты перыяд айчынная л-ра пачала ўключацца ў агульнаслав. кантэкст. З'явілася т.зв. пісьменніцкая крытыка (працы І.Навуменкі, В.Быкава, М.Стральцова і інш.), выйшлі зб-кі крыт. артыкулаў («Змена квадры» М.Тычыны, «Класікі і сучаснікі» У.Гніламёдава). На сучасным этапе свайго развіцця К.л. перажывае новы этап станаўлення, калі пераасэнсоўваюцца некаторыя метадалагічныя ўстаноўкі, вядзецца пошук новых крытэрыяў ацэнкі літ. твораў.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова